№29, красавік 2022 ISSN 2562-950

**Ігар Пракаповіч: Цэгла з гістарычнай манаграмай**

*Анатацыя.* Пры абследаванні старых мураваных будынкаў ў цэнтры Паставаў на чырвонай цэгле адной са сцен былі заўважаны клеймы ў выглядзе манаграм. Аўтар разам з памочнікамі правёў пошук іх прыналежнасці да патэнцыяльных уладароў цагельняў, якія размяшчаліся на тэрыторыі краю. Вызначылася, што гэтыя клеймы (MP TR, TR PM, VP TR) належаць да сямействаў Тызенгаўзаў і Пшаздзецкіх. Першыя цагельні ў Пастаўскім краі былі пабудаваны Антоніем Тызенгаўзам у сярэдзіне 18-га стагоддзя.

Напрыканцы 2021 года адбылося падвядзенне вынікаў Усебеларускай моладзевай экспедыцыі “Маршрутамі памяці. Маршрутамі адзінства”. У намінацыі “Скарбонка краязнаўчых знаходак” юныя даследчыцы Пастаўскай гімназіі Ліза Афанасьева і Карына Шубелька за работу “Чырвоная цэгла з манаграмай” атрымалі дыплом II ступені. У чым цікавасць гэтай працы?

Яшчэ ў 2018 годзе разам з вучнямі пастаўскай гімназіі мы абследавалі старыя мураваныя будынкі ў цэнтры Паставаў і зрабілі невялікае адкрыццё. На чырвонай цэгле, з якой складзена тыльная сцяна будынка “Хата-Бар” па вуліцы 17 верасня (Задзеўскай) маюцца клеймы ў выглядзе манаграм. Але тады не надалі патрэбнай увагі гэтай знаходцы, палічыўшы, што будаўнічы матэрыял быў выраблены дзесьці далёка ад нашага горада і выбітыя літары ніяк не звязаны з мясцовай гісторыяй. Аднак летам бягучага года, вывучаючы былыя мясцовыя цагельні, мы больш дэталёва абследавалі тую інтрыгуючую сцяну. І не дарэмна! Як высветлілася, на цаглінах маюцца не адна, а тры падобныя, але розныя манаграмы. Усе яны размяшчаюцца на тарцовых частках цаглін памеру 26 х 12 х 6 см. Клеймы ўяўляюць сабой спалучэнні літар MP TR, TR PM, VP TR. Што яны значаць і дзе выраблялася цэгла з такімі адбіткамі? Адказу на гэта пытанне не было.

Вывучаючы месцы, дзе раней былі цагельні, спадзяваліся адшукаць кавалкі цэглы з аналагічнымі манаграмамі, што дало б магчымасць сцвярджаць, што яна выраблена ў Паставах. Аднак усе знаходкі не мелі ніякіх адбіткаў. Праўда, адну цагліну з манаграмай усё ж знайшлі, але не ў полі ці на вуліцы, а ў экспазіцыі раённага краязнаўчага музея. Адкуль яна туды трапіла – невядома.

Мы зрабілі дапушчэнне, што цэгла, верагодна, выраблялася дзесьці на тэрыторыі Пастаўшчыны і была, хутчэй за ўсё звязана з уласнікамі цагельні. Пачалі больш уважліва пераглядаць матэрыялы па гісторыі Пастаў і выявілі, што першыя цагляныя

дамы з’явіліся ў нашым горадзе ў другой палове XVIII стагоддзя. Тагачасны ўласнік Антоній Тызенгаўз драўлянае паселішча ператварыў у каменны гарадок. У 60-80-х гадах было заснавана 8 прамысловых прадпрыемстваў, узведзена шмат барочных будынкаў, якія ўтварылі ў цэнтры горада закончаны архітэктурны ансамбль, на паўднёвай ускраіне пачата будаўніцтва палаца.

У гістарычных крыніцах маюцца звесткі пра тое, што для правядзення сваіх рэформ у Паставах у 1754 годзе А. Тызенгаўз заснаваў цагельны завод, які павінен быў забяспечыць патрэбы ў будаўнічых матэрыялах. У якім месцы знаходзлася цагельня А. Тызенгаўза вызначыць пакуль што не ўдалося, але можна меркаваць, што яна была дзесьці ў бліжэйшых ваколіцах тагачаснага мястэчка, магчыма, на ўсходнім беразе возера Пастаўскага, у Сасноўцы ці на месцы сучаснай аўтастанцыі. У канцы XIX стагоддзя каля сучаснай аўтастанцыі па вуліцы Вакзальнай размяшчаўся вялікі цагельны завод. Ён працаваў 120-150 дзён у год і выпускаў цэглу сярэдняй якасці.

Але гэта інфармацыя не дапамагла расшыфраваць загадкавую манаграму. І ўсё ж пошукі прывялі да адкрыцця! Праглядаючы спіс уласнікаў маёнтка Паставы за XVIII-XX стагоддзі мы ўбачылі імёны і прозвішчы, якія раскрылі таямніцу:
*1722 – Бенядыкт Тызенгаўз з жонкай Ганнай з Бяганскіх*
*60-я гады XVIII ст - Антоній Тызенгаўз*
*1785 – Францішак Ксаверы Хамінскі з жонкай Сафіяй з Тызенгаўзаў*
*1809 – Ігнацы Тызенгаўз*
*1814 – Канстанцін Тызенгаўз з жонкай Валерыяй з Ваньковічаў*
*1853 – Райнольд Тызенгаўз*
*1880 – Марыя Пшаздзецкая з Тызенгаўзаў*
*1890 – Юзаф Пшаздзецкі*
*1939 – Райнольд Пшаздзецкі*

На цэгле зашыфраваны імёны і прозвішчы Райнольда Тызенгаўза і Марыі Пшаздзецкай, брата і сястры, якія былі дзецьмі ўласніка Пастаўскага маёнтка Канстанціна Тызенгаўза. Такім чынам, расшыфроўваем манаграмы так:
MP TR - Марыя Пшаздзецкая Тызенгаўз Райнольд
TR PM - Тызенгаўз Райнольд Пшаздзецкая Марыя
VP TR - Віп-персона (VIP Persona) Тызенгаўз Райнольд (хоць першая літара можа быць не поўнасцю адбітая M, але V выглядае вельмі выяўна).

Канстанцін Тызенгаўз памёр у 1853 годзе і Паставы разам з больш чым дзвюма дзесяткамі маёнткаў перайшлі ў спадчыну ягонаму сыну Райнольду, які шмат у чым, асабліва ў культурніцкай дзейнасці, прадоўжыў справу бацькі. Райнольд атрымаў выдатную адукацыю і меў схільнасці да літаратурнай працы. Ён з’яўляўся аўтарам

дзесяці кніг пераважна філасофска-асветніцкага зместу. Пры Р. Тызенгаўзе ў Паставах пачала дзейнічаць аркестрава-харавая школа, вучнямі якой былі жыхары мястэчка і вакольных вёсак.

Райнольд Тызенгаўз не меў нашчадкаў і сваё багацце пасля смерці (1881 год) пакінуў сястры Марыі, якая была замужам за вядомым гісторыкам і пісьменнікам Аляксандрам Пшаздзецкім. Марыя нарадзілася ў 1823 годзе, атрымала добрае прыватнае выхаванне. Ад бацькі навучылася музыцы, маляванню і арніталогіі. Брала ўрокі жывапісу ў самаго Дэлакруа, заснавальніка французскага рамантызму. Альбом з уласнымі выявамі кляштароў і касцёлаў яна падаравала Папе Рымскаму Леону XIII на яго залаты юбілей. Магчыма, гэта была свайго роду ўдзячнасць Папу за дазвол выйсці замуж за Аляксандра Пшаздзецкага. Жаніх даводзіўся Марыі стрыечным братам і з прычыны роднаснасці крыві дазвол на шлюб трэба было браць у Рыме. Вяселле адбылося ў апартаментах бабулі нявесты Марыяны Тызенгаўз з Пшаздзецкіх у Варшаве 24 лістапада 1842 года. Разам з мужам Марыя жыла у Італіі, Францыі, Польшчы; Паставы наведвала вельмі рэдка. У 1871 годзе аўдавела. Пасля смерці брата Райнольда была вельмі багатая. Займалася дабрачыннасцю, шмат грошай ахвяравала на мастацтва і на будаўніцтва і падтрымку касцёлаў. З яе фундацыі быў узведзены касцёл св. Антонія Падуанскага ў Паставах, яна ж дала 5000 злотых праваслаўным вернікам на будаўніцтва царквы ў мястэчку пасля таго, як стары храм згарэў у агні пажару. Памерла Марыя Тызенгаўз-Пшаздзецкая у 1890 годзе ў Варшаве. У шлюбе з А. Пшаздзецкім мела сыноў Канстанціна і Густава.

Можна меркаваць, што на цагельні цэгла выраблялася з такімі клеймамі, калі і Райнольд, і Марыя яшчэ жылі, прычым, Марыя ўжо была замужам за Аляксандрам Пшаздзецкім. Райнольд Тызенгаўз памёр у 1881 годзе, вяселле сястры адбылося ў 1842-м. З гэтага вынікае, што цэглу з манаграмамі выпускалі дзесьці ў сэрэдзіне XIX стагоддзя. Але дзе? Ні ў Сасноўцы, ні на месцы аўтастанцыі кавалкаў з клеймамі знайсці не удалося. Мажа варта было б лепш пашукаць…

Нечаканую падказку мы атрымалі падчас краязнаўчай вандроўкі, якую здзейснілі 2 кастрычніка 2021 года ў гарадскі пасёлак Варапаева, дзе шукалі рэшткі мясцовай цагельні. Знаходзілася яна на тэрыторыі былога дрэваапрацоўчага камбіната. Патрапіць туды нам не ўдалося, але мясцовы жыхар, у якога мы распытвалі пра цагельню, перадаў нам у падарунак кавалак цэглы, які ён знайшоў недалёка ад былога мясцовага завода. На ёй захавалася вядомая ўжо нам манаграма. Так што пошукі будуць працягвацца.

А тыльную сцяну ў будынку “Хата-Бар” варта было б узяць пад ахову і абвесціць помнікам гісторыі мясцовага значэння, бо існуе небяспека, што яе затынкуюць або

№29, красавік 2022 ISSN 2562-950

закрыюць сайдынгам. Да таго ж, там ёсць і контрфорс – трохкутная каменная прыбудова, якая ўмацоўвае сцяну. У архітэктуры нашага горада гэта вельмі адметны элемент. Контрфорсы меў крыты рынак на плошчы, ёсць яны ў “Старым млыне” і яшчэ ў некаторых будынках. Мінуўшчыну трэба захоўваць. Разбураць – проста, аднаўляць – намнога цяжэй.

*І.М.Пракаповіч, настаўнік геаграфіі пастаўскай гімназіі, кіраўнік даследчай працы*




*Вучаніцы-даследчыцы Ліза Афанасьева і Карына Шубелька*

№29, красавік 2022 ISSN 2562-950




*Гістарычныя манаграмы*



*Аўтар з варапаеўскай знаходкай*




*Удзельнікі вандроўкі ў Варапаева*

**Ihar Prakapovich: Historical Monogram on Brickwork**
*(webzine “**Kultura. Natsyja**”, issue 29, April 2022, 182-188, www.sakavik.net)*

While examining old stone buildings in the centre of Pastavy one can decipher on one of the walls’ red brickworks labels showing up as monograms. The author together with his coworkers investigated the issue of potential owners of the brickwork that was present in the vicinity. It turns out that the labels (MP TR, TR PM, VP TR) belong to the households of Tyzengauz and Pshazdetski. The first brickworks in Pastavy Region were built by Antony Tyzengauz in the middle of the 18th century.

**Игорь Прокопович: Историческая монограмма на кирпичной кладке**
**(веб-журнал «Культура. Нацыя», выпуск 29, апрель 2022, стр. 182-188, www.sakavik.net)**
При осмотре старинных каменных построек в центре Постав можно расшифровать на одной из стен из красного кирпича надписи в виде монограмм. Автор вместе с коллегами исследовал вопрос о потенциальных владельцах находившегося поблизости завода по производству кирпича. Оказалось, что метки (MP TR, TR PM, VP TR) принадлежат домам Тызенгаузов и Пшаздецких. Первые кирпичные заводы в Поставском крае были построены Антонием Тизенгаузом в середине 18 века.